**УДК 373.31**

# ФАРМІРАВАННЕ МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

**Мурашка Наталля Уладзіміраўна**
Аспірант Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка
Навуковы кіраўнік – Турчанка Ірына Аляксееўна
Мінск, Рэспубліка Беларусь

***Анатацыя:*** *праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў выклікае неабходнасць пошуку новых шляхоў, якія б спрыялі эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечвалі дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.*

***Ключавыя словы:*** *фальклор, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, этнапедагагічны падыход.*

Актуальнасць звароту да фальклору выцякае з філасофіі, якая паказвае на неабходнасць дыялогу культур, што немагчыма без пазнання свайго этнасу і сваёй традыцыйнасці. Ва ўмовах сучаснай сістэмы адукацыі ключавой задачай з'яўляецца далучэнне новых пакаленняў да гістарычнай памяці народа, а значыць, і захаванне яе ў нашых дзецях. Свядомая, мэтанакіраваная дзейнасць па асэнсаванні культурных традыцый спрыяе развіццю творчых здольнасцей, фарміраванню маральных якасцей, выхоўванню патрыятычных пачуццяў малодшых школьнікаў, а сістэматычная праца з фальклорнымі творамі дапамагае настаўнікам у актывізацыі рэцэптыўных (слуханне і чытанне), стымуляванні прадуктыўных (гаварэнне, пісьмо) відаў маўленчай дзейнасці вучняў, і фарміраванні камунікатыўных уменняў праз узаемадзеянне з дарослымі і аднагодкамі. Акрамя таго вывучэнне фальклорнай спадчыны з'яўляецца дзейсным метадам гуманізацыі выхавання дзяцей і змяшчае мноства метадаў педагагічнага ўздзеяння на навучэнцаў.

Сучасная навука не дае адзінай трактоўкі паняцця «фальклор»: часам яно ўжываецца як «… мастацтва, якое ствараецца народам і існуе ў паўсядзённым жыцці», характарызуецца «вусным спосабам вербалізацыі і адсутнасцю аўтарства» [1], а часам выкарыстоўваецца ў больш вузкім значэнні – вусная народная творчасць [2]. У нашым даследаванні тэрмін «фальклор» мы разумеем у яго шырокім значэнні, маючы на ўвазе традыцыі, звычаі, абрады, гульні, а таксама створаныя народам творы (вусная народная творчасць, песні, танцы і інш.), якія перадаюцца ад пакалення да пакалення.

Фальклор беларускага народа вельмі багаты і разнастайны, а фальклорныя творы не толькі нясуць у сабе пэўныя вобразы, якія даступныя і цікавыя дзецям, але і маюць вялікі адукацыйны і выхаваўчы патэнцыял. Гэта навяло нас на думку, што рэалізацыя этнапедагагічнага падыходу ў навучанні дазволіць атрымаць новыя ўяўленні аб уплыве фальклору на працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, якая вызначаецца намі як практычнае валоданне малодшымі школьнікамі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці ў розных сітуацыях зносін на аснове набытых моўных ведаў і сфарміраваных камунікатыўных уменняў.

Этнапедагагічны падыход, сутнасць якога заключаецца ў тым, «… каб заявіць і рэалізаваць у тэорыі і на практыцы магчымасці этнапедагогікі, традыцыйнай культуры народаў у сістэме сродкаў станаўлення, развіцця і адукацыі асобы для духоўнага, сацыяльна-этнічнага адэкватнага самавызначэння»[3, с. 68], разглядаецца сучаснай навукай як сукупнасць метадалагічных прынцыпаў, абгрунтаваных з пазіцыі этнапедагогікі [4]. Асноўнымі прынцыпамі падыходу выступаюць прыродазгоднасць (апора на натуральнае

развіццё дзіцяці, яго патрэбы і магчымасці), уключэнне народнай педагогікі ў кантэкст агульнай культуры (выкарыстанне станоўчых, адказ ад непрагрэсіўных метадаў і сродкаў навучання і выхавання), ранняе і гарманічнае выхаванне.

Этнапедагогіка канцэнтруе ўвагу перш за ўсё на народных традыцыях выхавання, што, на думку Н. С. Гарошкі, звужае саму ідэю этнапедагагічнага падыходу [5, с. 39], таму яна апісвае яго як «… вызначэнне аптымальных шляхоў арганізацыі педагагічнага (адукацыйнага) працэсу на аснове ўліку этнакультурных патрэбаў» [5, с. 39–40]. Грунтуючыся на дадзенай пазіцыі, разгледзім мачымасці выкарыстання фальклору ў адукацыйным працэсе, які, згодна з артыкулам 1 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, уяўляе сабой «… навучанне і выхаванне, арганізаваныя ўстановай адукацыі ў мэтах асваення навучэнцамі зместу адукацыйных праграм»[6].

Выкарыстанне фальклорных твораў у працэсе навучання беларускай мове абумоўлена іх адпаведнасцю адукацыйна-выхаваўчым задачам урокаў. Фальклор можна выкарыстоўваць для:

- фарміравання граматыка-арфаграфічных уменняў, у якасці дыдактычнага матэрыялу пры гукавым, лексічным, граматычным і арфаграфічным аналізе фактаў мовы;
- узбагачэння маўлення вучняў вобразнымі сродкамі, у якасці матэрыялу для чытання, пераказу і завучвання на памяць;
- фарміравання станоўчых адносін да роднай мовы, правільнай ацэнкі жыццёвых фактаў, выхавання маральна-этычных якасцей асобы.

Выкарыстанне фальклору ў працэсе выхавання малодшых школьнікаў, згодна з агульнымі палажэннямі дзеючай Канцэпцыі няспыннага выхавання дзяцей і моладзі [7] і з мэтамі і асноўнымі напрамкамі Праграмы няспыннага выхавання дзяцей і моладзі на 2021–2025 гг. [8] праз сэнсавую нагрузку фальклорных твораў садзейнічае яго рэалізацыі ў такіх накірунках, як:

- ідэалагічнае выхаванне: адэкватнае стаўленне да культурнай спадчыны, гістарычных дасягненняў, разуменне сябе і свайго месца ў грамадстве;
- грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне: патрыятызм, нацыянальная самасвядомасць;
- духоўна-маральнае выхаванне: далучэнне да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, прапаведванне працавітасці, сціпласці, дабратворчасці, міласэрнасці, гасціннасці, павагі да іншых;
- полікультурнае выхаванне: талерантнае стаўленне да прадстаўнікоў іншых культур праз станоўчыя адносіны да традыцый свайго народа;
- экалагічнае выхаванне: культ сонца, вады і зямлі, беражлівыя адносіны не толькі да ўсяго жывога ў прыродзе, але і да прадуктаў харчавання (разумнае спажыванне);
- сямейнае і гендэрнае выхаванне: культ сям'і, асэнсаванне роляў мужчын і жанчын у жыцці, павага да старэйшых, клопат пра дзяцей, хворых, слабых, бездапаможных.

Акрамя таго, зацікаўленасць фальклорнай дзейнасцю спрыяе выхаванню псіхалагічнай культуры малодшага школьніка праз творчае і асабістае развіццё асобы і эстэтычнаму выхаванню, праз далучэнне вучняў да нацыянальнай культуры.

Такім чынам, этнапедагагічны падыход дае магчымасць арганізацыі шматбаковай працы па развіцці малодшых школьнікаў, пад час якой фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі адбываецца адначасова з патрыятычным і духоўна-маральным выхаваннем вучняў, паколькі фальклор і фальклорныя творы разглядаюцца не

толькі з пазіцыі літаратурнага мастацва, а і з пазіцыі носьбіта народнай маралі. Рэалізацыя дадзенага падыходу робіць працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі адпаведным сучасным накірункам педагагічнай навукі, нацыянальным традыцыям, культурна-гістарычным асаблівасцям і агульначалавечым каштоўнасцям.

У якасці практычнага ўвасаблення ўсяго вышэйапісанага намі распрацавана праграма аб’яднення па інтарэсах «Фальклорная скарбонка», якая прапануецца для навучэнцаў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі школ з рускай мовай навучання і выхавання. Змест праграмы грунтуецца на фальклоры беларускага народа і накіраваны на фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі праз стварэнне натуральнага беларускамоўнага асяроддзя ў школах з рускай мовай навучання і выхавання.

Заняткі аб’яднання па інтарэсах «Фальклорная скарбонка» распрацаваны з улікам узроставых асаблівасцяў і магчымасцяў вучняў, паступовага павелічэння ступені выкарыстання беларускай мовы вучнямі ў сітуацыях зносін, вучэбных праграм па вучэбных прадметах для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання, максімальнага выкарыстання міжпрадметных сувязяў вучэбных прадметаў (беларускай мовы, літаратурнага чытання, чалавека і свету, выяўленчага мастацтва, музыкі і працоўнага навучання), сучаснага і народнага календара святаў і складаецца з трох частак:

- «Нас бабуля забаўляла»;
- «Казачная гасцёўня»;
- «Святы і абрады беларусаў».

Частка «Нас бабуля забаўляла» прызначана для навучэнцаў 1 класа і ў асноўным прадстаўлена малымі жанрамі вуснай народнай творчасці і беларускімі народнымі гульнямі. На працягу года першакласнікі праз інтэрактыўныя метады навучання і гульнёвыя формы засвойваць прыказкі, прымаўкі, скорагаворкі, лічылкі, знаёмяцца з некаторымі беларускімі народнымі казкамі, традыцыяй святкавання «Масленіцы» на Беларусі і гуляюць у беларускія народныя гульні. Лагічным заканчэннем гэтай часткі з’яўляецца адкрыты занятак для бацькоў «Нас бабуля забаўляла», пад час якога навучэнцы дэманструюць тыя веды, якія атрымалі на працягу навучальнага года.

Другая частка – «Казачная гасцёўня», якая прызначана для навучэнцаў 2 класса, дзе пад час заняткаў дзеці вывучаюць беларускія народныя казкі і знаёмяцца з такімі беларускімі народнымі святамі як «Каляды», «Вялікдзень» і «Купалле». Заканчваецца гэтая частка адкрытым святочным мерапрыемствам для бацькоў «Свята казкі», дзе навучэнцы расказваюць і паказваюць урыўкі з вывучаных імі казак.

Апошняя частка называецца «Святы і абрады беларусаў», якая накіравана на знаёмства і вывучэнне беларускіх народных святаў і абрадаў. На працягу 3 і 4 класаў малодшыя школьнікі не толькі больш падрабязна знаёмяцца з беларускімі традыцыямі, расказваюць пра іх бацькам і вучням пад час адкрытых мерапрыемсваў, але і самі робяць рэканструкцыю абрада «Калядаванне» і праводзяць святочнае мерапрыемства «Масленіца» для вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Заняткі, у залежнасці ад задач, якія выраращаюцца, прадугледжваюць паўтарэнне вывучанага на папярэдніх занятках матэрыялу, маўленчую размінку, выкарыстанне інтэрактыўных метадаў навучання і інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій, дыдактычныя гульні для пашырэння маўленчага вопыту вучняў і актывізацыі іх слоўнікавага запасу, беларускія народныя гульні ў якасці змены дзейнасці навучэнцаў і для фарміравання іх камунікатыўных уменняў, рэфлексію.

Абавязковай умовай з’яўляецца завучванне на памяць скорагаворак, прыказак і прымавак, лічылак, інсцэніроўка казак, удзел навучэнцаў у расповедзе пра тое ці іншае свята.

Пад час заняткаў дзеці заўсёды знаходзяцца ў розных відах дзейнасці: маўленчай, камунікатыўнай, гульнёвай ці творчай, якія змяняюць адзін адну.

Паколькі малодшы школьны ўзрост характарызуецца высокай эмацыянальнасцю, уражлівасцю і звернутасцю да міру пазітыўных каштоўнасцяў, то важным момантам з'яўляецца атмасфера заняткаў аб'яднання па інтарэсах «Фальклорная скарбонка», для эфектыўнасці і пасяховасці якіх неабходна стварыць шэраг умоў:

- дзейнасць павінна выклікаць у вучняў станоўчыя эмоцыі: адчуванне пачуцця радаснага задавальнення ад таго, што выконваецца, спрыяе ўзнікненню імкнення па ўласнай ініцыятыве, без прымусу ажыццяўляць гэтую дзейнасць;
- дзейнасць павінна быць па магчымасці творчай;
- арганізаваць дзейнасць вучня трэба так, каб ён імкнуўся да мэты, якая нязначна праўзыходзіць яго магчымасці і ўжо дасягнуты ім ўзровень выканання дзейнасці;
- неабходна стымуляваць дзейнасць: адной з формаў стымуляцыі патрэбы ў моўных зносінах з'яўляецца пахвала як станоўчае падмацаванне дасягненняў вучняў і стварэнне сітуацыі поспеху.

Такім чынам, вывучэнне беларускага фальклору пад час заняткаў аб'яднання па інтарэсах «Фальклорная скарбонка» спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў, а сам фальклор выступае сродкам адукацыйнага працэсу, які садзейнічае каштоўнастнаму стаўленню да беларускай мовы, фарміраванню культуры міжнацыянальных адносін і гарманічнаму развіццю асобы.

Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ ГР1209).

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Энциклопедия эпистемологии и философии науки / И. Т. Касавин [и др.] ; под ред. И. Т. Касавина. – М. : Канон-Плюс, 2009. – 1247 с.
2. Ефремова, Т. Ф. Новый словарь русского языка : Толково-словообразовательный : в 2 т. / Т. Ф. Ефремова. – 2-е изд. – М. : Русский язык, 2001. – Т. 2 : П – Я. – 1084 с.
3. Денисенко, Е. П. Этнопедагогический подход в нравственно-патриотическом воспитании современной школы / Л. Н. Денисенко, Е. П. Денисенко // Актуальные исследования. – 2021. – № 40. – С. 66–70.
4. Любимова, Ю. С. Этнопедагогический подход как основа эстетического воспитания младших школьников / Ю. С. Любимова // Весці БДПУ. Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2007. – № 2. – С. 15–19.
5. Горошко, Н. С. Импликативная игровая модель обучения как средство формирования коммуникативной компетентности будущего учителя : дис. … канд. пед. наук : 13.00.08 / Н. С. Горошко. – Минск, 2009. – 193 л.
6. Кодекс Республики Беласрусь об образовании [Электронный ресурс] : 13 января 2011 г., № 243-З : принят Палатой представителей 2 дек. 2010 г. : одобр. Советом Респ. 22 дек. 2010 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 14.01.2022 г., № 154-З // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь – Режим доступа: http://www.Pravo.by/document/?guid=3871&p0=Hk1100243. – Дата доступа: 29.06.2022.
7. Концепции непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи [Электронный ресурс] : 15 июл. 2015 г., № 82 : увержден Министератвом образования Респ. Беларусь 15 июл. 2015 г. // Национальный образованельный портал – Режим доступа: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/organizatsiya-vospitaniya-2022-2023.html. – Дата доступа: 25.06.2023.
8. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи [Электронный ресурс] : 31 дек. 2020 г., № 312 : увержден Министератвом образования Респ. Беларусь 31 дек. 2020 г. // Национальный образованельный портал – Режим доступа: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/organizatsiya-vospitaniya-2022-2023.html. – Дата доступа: 25.06.2023.